# АДЗІНАЯ «ПЕСНЯ...» НА ЎСЮ БЕЛАРУСЬ

Рэдкую магчымасць пабачыць арыгінал скарынаўскага выдання кнігі «ПЕСНЯ ПЕСНЯМ» мелі 9 студзеня госці сталічнага Палаца прафсаюзаў. Адзіны на Беларусі (і, на жаль, няпоўны) экземпляр кнігі з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі быў выстаўлены тут з нагоды свайго юбілею.

Гісторыя захавала дату выхаду выдання ў свет. Гэта адбылося ў Празе 475 гадоў назад, 9 студзеня 1518 года.

Гадавіне і было прысвечана «Свята беларускай Бібліі», арганізаванае Беларускай каталіцкай грамадой пры падтрымцы акцыянернага таварыства «Кросны».